# Працягваючы традыцыі: адбылася ўрачыстая сустрэча ў Мемарыяльнага знака воінам-сувязістам

Пачатак мая ў Беларусі адзначаны шэрагам важных дат. 7 мая адзначаецца прафесійнае свята - Дзень работнікаў радыё, тэлебачання і сувязі, а 9 мая наша краіна сустракае Вялікі Дзень Перамогі. У галіне сувязі ўрачыстыя мерапрыемствы з гэтай нагоды ўжо шмат гадоў пачынаюцца з нязменнай традыцыі: ускладання кветак да мемарыяльнага знака воінам-сувязістам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

4 мая, напярэдадні двух святочных дат, ля мемарыяла сустрэліся прадстаўнікі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, галіновых арганізацый, выкладчыкі і студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі, прадстаўнікі кампаній сферы ІКТ, лідэры прафсаюзных арганізацый. Ганаровым госцем мерапрыемства стаў генерал-лейтэнант Новікаў Анатоль Мікалаевіч.

З прывітальным словам да прысутных звярнуліся першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Дзмітрый Шэдко, старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў сувязі Ніна Гаўрылава, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі Андрэй Зяневіч.

Аддаючы даніну памяці вялікаму подзвігу ваенных сувязістаў, удзельнікі ўшанавалі іх памяць хвілінай маўчання.

Сустрэча ля памятнага знака аб'ядноўвае шматлікія пакаленні сувязістаў, моладзь і ветэранаў. Разам з віншаваннямі ў гонар прафесійнага свята сёння гучалі словы шчырай удзячнасці салдатам Вялікай Айчыннай за іх мужнасць і гераізм, сілу духу і веру ў перамогу.

Завяршылася мерапрыемства ўскладаннем кветак да мемарыяльнага знака воінам-сувязістам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/04-05-2017-1973*